ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1979 г. 29 ЛІСТАПАДА ЧАЦВЕР

№ 34 (1260)

Цана 2 кап.

## Навіны БДУ

### НАДЗЁННЫЯ ЗАДАЧЫ

жыцця універсітэта былі абмеркаваны на чарговым пасяджэнні рэктарата.

Прысутныя разгледзелі пытанні аб падрыхтоўцы да 60-гадовага юбілею Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, аб ходзе выканання вучэбнага плана на філалагічным факультэце і факультэце прыкладной матэматыкі і іншыя.

### АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭННЕ

прафкома універсітэта. На парадку дня стаяла пытанне аб размеркаванні абавязкаў паміж членамі новага саставу прафкома.

Упершыню створана новая камісія — будаўнічая. Асноўным напрамкам яе работы з'яўляецца падрыхтоўка памяшканняў, вучэбных карпусоў, аўдыторый да пачатку новага навучальнага года, спартыўна - аздараўленчага лагера і баз да заезду студэнтаў, кантроль за будаўніцтвам новых аб'ектаў універсітэта.

### ПАПУЛЯРНАСЦЮ КАРЫСТАЕЦЦА

сярод студэнтаў маладзёжны музычны клуб, створаны на філалагічным факультэце. Тут можна даведацца шмат цікавага аб жыцці вядомых кампазітараў, выканаўцаў, сустрэцца са спевакамі, артыстамі.

На днях адбыліся чарговыя заняткі клуба на тэму «Моцарт і Сальеры». Аб жыцці і творчасці выдатнага аўстрыйскага кампазітара расказаў музыказнаўца А. Парэцкі. Артысты Белдзяржфілармоніі выканалі інструментальную музыку і арыі з опер Моцарта.

110-й ГАДАВІНЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

# ПЕРАКЛІЧКА ФАКУЛЬТЭТАЎ

### ФІЛАЛАГІЧНЫ

«Справа Леніна жыве і перамагае» — пад такой назвай на філалагічным факультэце праходзяць ленінскія чытанні. Праслуханы лекцыі «Гістарычныя заваёвы сацыялізму, замацаваныя ў Канстытуцыі СССР,— ажыццяўленне бессмяротных ленінскіх ідэй» і «КПСС — партыя Леніна, ядро палітычнай сістэмы савецкага грамадства».

У групах і на курсах праводзяцца камсамольскія сходы: «Вучыцца, жыць і працаваць па-ленінску».

Камсамольцы факультэта актыўна ўдзельнічаюць у сацыялістычным спаборніцтве за права быць сфатаграфаваным ля помніка У. І. Леніну.

### ГІСТАРЫЧНЫ

Сумесна з савецкімі студэнтамі на факультэце да свята рыхтуюцца і навучэнцы з замежных краін. Яны актыўна ўдзельнічаюць у правядзенні камсамольскіх сходаў, тэматычных палітінфармацый, інтэрнацыянальных вечароў і спартыўных мерапрыемстваў. Разам з нашымі рабятамі распрацоўваюць і выконваюць свае комплексныя планы, якія прадугледжваюць выкананне абавязацельстваў студэнтамі перад іх зямляцтвамі.

Хочацца адзначыць і тое, што на ленінскім суботніку, які будзе праходзіць у красавіку, прымуць удзел студэнты з 14 замежных краін.

### ЖУРНАЛІСТЫКІ

«Насустрач Леніну» — так называецца новая рубрыка, якая адкрыта ў насценнай газеце будучых журналістаў. Матэрыялы расказваюць аб людзях, якім у юнацтве пашчасціла бачыць У. І. Леніна.

Успамінамі аб гэтых сустрэчах дзеляцца акадэмік АН БССР У. А. Сербента, былы загадчык кафедры палітычнай эканоміі БДУ У. А. Тамашэвіч.

Матэрыялы падрыхтаваны студэнтамі IV курса І. Гаўрыцкім і А. Груздзіловічам да Усесаюзных ленінскіх чытанняў у рэспубліцы.

### ХІМІЧНЫ

У гонар 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна на факультэце разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі камсамольцамі і акадэмічнымі групамі, бягучыя вынікі якога адлюстроўваюцца на адпаведных стэндах.

Перад сектарамі камітэта камсамола і пярвічнымі камсамольскімі арганізацыямі пастаўлена задача павышэння эфектыўнасці камсамольскай работы. Для гэтага ўкараняецца ў практыку новая сістэма кантролю і ацэнкі дзейнасці ўсіх звенняў камсамольскай арганізацыі.

# ТЭХНІКА, ФАНТАЗІЯ І СТУДЭНТЫ

ФОТАРЭПАРТАЖ



Аўдыторыя № 314 мала чым адрозніваецца ад іншых. Толькі на кожным стале стаіць невялічкі прыбор, які нагадвае сукупнасць пішучай машынкі і мінітэлевізара. Гэта і ёсць ЭВНС (электронная вылічальна-навучальная сістэма). Яе распрацавалі калектыў выкладчыкаў кафедры электронных матэматычных машын. Ужо некалькі год ідзе паспяховае навучанне студэнтаў пры дапамозе гэтай сістэмы. Тут правяраюць і набываюць веды студэнты розных факультэтаў: хімічнага, матэматычнага, фізічнага. У той дзень, калі былі зроблены гэтыя здымкі, над прыборамі чаравалі фізікі.

Здзівіла вось што. Празвінеў званок на перапынак, але ніхто са студэнтаў і не крануўся з месца. Быццам званка і не было. Кожны працягваў засяроджана працаваць над сваёй задачай. На фотаапарат ужо ніхто не звяртаў увагі.

(Працяг на 2-й стар.).

# Юрысты вучацца

НА БАЗЕ універсітэта адбылася чарговая двухдзённая рэспубліканская нарада-семінар па павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў прававых дысцыплін ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Удзельнікі семінара заслухалі даклад «Аб формах і метадах ідэйна-палітычнага выхавання студэнцкай і вучнёўскай моладзі ў святле патрабаванняў пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы», з якім выступіў начальнік Упраўлення выкладання грамадскіх навук Мінвуза БССР С. А. Малевіч; абмеркавалі вучэбна-метадычную лекцыю з прымяненнем тэхнічных сродкаў навучання: «Дагавор найма жылога памяшкання» дэкана юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна прафесара В. Ф. Чыгіра.

З лекцыямі па пытаннях тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, савецкага будаўніцтва, грамадзянскага і сямейнага права, правоў і абавязкаў грамадзян СССР выступілі вучоныя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, Беларускага політэхнічнага інстытута і Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава.

Удзельнікі нарады-семінара абмеркавалі методыку падрыхтоўкі і чытання лекцый па савецкаму праву, азнаёміліся з вучэбна-метадычнай базай юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, абмяняліся вопытам прымянення асноўных палажэнняў Канстытуцыі СССР і Беларускай ССР у курсе выкладання прававых дысцыплін у ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, абмеркавалі падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па курсу «Савецкае права».

У выніку абмеркавання была выпрацавана адзіная думка па найбольш эфектыўнай арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу па прававых дысцыплінах, выкарыстанню ў вучэбным працэсе наглядных дапаможнікаў і тэхнічных сродкаў навучання.

У рабоце семінара прынялі ўдзел і выступілі намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Т. Т. Дзмітрыева і намеснік старшыні Вярхоўнага суда БССР В. Г. Сідарэнка.

**В. ВАСІЛЬЕЎ,**
**старшы метадыст сектара ВНУ.**

# Тэхніка, фантазія і студэнты

**ФОТАРЭПАРТАЖ**



(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

І вось яны, моманты работы. Работы цікавай і захапляючай. Шмат узнікае пытанняў, патрабуючых неадкладнага вырашэння.

У каго ўсё ў парадку, а ў каго і не ладзіцца з рашэннем. У такім выпадку на дапамогу прыходзіць выкладчык. Гэта ён можа рабіць непасрэдна са свайго пульта.

(Заканчэнне на 3-й стар.).



**ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ: ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ**

# З улікам узрослых патрабаванняў

МАЛАДЫЯ спецыялісты, якія закончылі універсітэт, павінны валодаць поглядам і арыентацыяй для практычнай работы ў народнай гаспадарцы. Але не заўсёды бывае так. Выпускнікам даводзіцца праходзіць перападрыхтоўку на прадпрыемстве.

У пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» гаворыцца, што размяркоўваць маладых спецыялістаў патрэбна за адзін—тры гады да заканчэння. Матэматыкаў, відаць, трэба размяркоўваць за тры гады з пачатку спецыялізацыі, і тады многія праблемы будуць вырашаны. Бо рыхтаваць значна лепш можна ва ўмовах вучэбнага плана, які існуе. Важна звярнуць сур'ёзную ўвагу на фундаментальную матэматычную падрыхтоўку і прыкладныя аспекты. Па кожнаму напрамку матэматычнай навукі пажадана было б мець больш вучэбнага часу, але гэта нельга здзейсніць у рамках абмежаваных магчымасцей (36 вучэбных гадзін у тыдзень). Да таго ж, атрымліваецца парадокс: на факультэце прыкладной матэматыкі няма вылічальнага пакоя, няма кабінета па праграміраванню, а ёсць лабараторыі малых вылічальных машын. Я не хачу сказаць, што яны не патрэбны. Але што важней? Тэхнічная дакументацыя па АС ЭВМ, якой карыстаюцца сотні студэнтаў, маецца ў адным-двух экземплярах. Без кабінета немагчыма яе рацыянальнае выкарыстанне. Патрэбна спецыялізаваная бібліятэка-кабінет, патрэбна вылічальная зала, дзе студэнты змогуць рыхтаваць свае праграмы. Вельмі неабходны дысплеі, а таксама магчымасць тэрміновай перфарацыі (у час заняткаў па практыкуму на ЭВМ), каб выкладчык мог адразу праверыць правільнасць падрыхтаванага да выканання на ЭВМ праекта праграм. Зараз жа значная частка работы выкладчыка праходзіць у калідорах, дзе ён правярае і падпісвае студэнцкія заданні.

Гавораць, што мы на ФПМ рыхтуем праграмістаў. Але ж гэта ў корані не так. Мы рыхтуем спецыялістаў у галіне прыкладной матэматыкі. І зразумела, нашы студэнты павінны свабодна валодаць ЭВМ пры высокім узроўні фундаментальных ведаў па матэматыцы.

Калектыў кафедры агульнага праграміравання робіць усё магчымае для паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Вялікая работа вядзецца па падрыхтоўцы вучэбнай і метадычнай літаратуры па дысцыплінах «ЭВМ і праграміраванне», «Практыкум на ЭВМ» і вучэбнай практыцы. Так, толькі ў 1979 годзе выдадзена 11 назваў вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтаў I—II курсаў агульным аб'ёмам 33 друкаваныя аркушы. У 1980 годзе мы плануем у асноўным завяршыць работы па распрацоўцы вучэбна-метадычнай літаратуры для студэнтаў I—II курсаў і перайсці да распрацоўкі пытанняў тэхналогіі структурнага праграміравання і вучэбна-метадычнай літаратуры па спецыялізацыі.

Шмат увагі аддаецца пытанням навукова-даследчай работы студэнтаў. На кафедры функцыяніруе СНДЛ, дзе працуюць звыш 70 студэнтаў. 87 дакладаў зроблена студэнтамі кафедры на студэнцкай навуковай канферэнцыі. Многія работы студэнтаў кафедры аднесены да першай катэгорыі на рэспубліканскім аглядзе, адзначаліся прэміямі. Асаблівым гонарам з'яўляюцца работы студэнтаў кафедры, дарэчы, адзіныя за апошнія тры гады на факультэце, якія адзначаліся дыпломамі Мінвуза СССР і ЦК ВЛКСМ як лепшыя работы ў галіне матэматыкі ў краіне. Гэта работы Г. Даўжанковай, Г. Ермакова, А. Зантовіча. Па незразумелых прычынах кіраўніцтва факультэта адмовілася нават паставіць подпіс пад віншаваннямі лаўрэатам Усесаюзнага конкурсу. Не былі заахвочаны кіраўнікі лаўрэатаў. Мне здаецца, што адносіны да НДР студэнтаў павінны быць іншымі.

Шмат сіл і энергіі аддаюць выкладчыкі кафедры прафесійнай арыентацыі навучэнцаў, праблемам ранняй спецыялізацыі. На кафедры працуюць на грамадскіх пачатках вочная і завочная школы «Юны праграміст». Аб поспеху гэтай работы можа гаварыць такі факт: 92 (трэцяя частка набору на ФПМ) выпускнікі школы паступілі ў гэтым годзе на факультэт прыкладной матэматыкі.

У цеснай сувязі праводзіцца на кафедры ўся навуковая, гасдагаворная, вучэбна-метадычная і выхаваўчая работа. Калектыў кафедры агульнага праграміравання з вялікім натхненнем успрыняў пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб вышэйшай школе і рашэнні XIX пленума ЦК КПБ, актыўна працуе над іх здзяйсненнем. Мы спадзяёмся, што ўзнятыя тут пытанні знойдуць разуменне у тых, ад каго залежыць іх рашэнне.

**Г. ДРАБУШЭВІЧ,**
**загадчык кафедры агульнага праграміравання.**

# Размеркаваны абавязкі

**АДБЫЎСЯ ПЕРШЫ АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПЛЕНУМ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ, НА ЯКІМ БЫЛІ РАЗМЕРКАВАНЫ АБАВЯЗКІ:**

П. Брыгадзін — сакратар камітэта камсамола, кандыдат гістарычных навук;

В. Левашэвіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце;

А. Гаралёва — намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце;

В. Гарус — намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрвыхаванню;

А. Абрамовіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай рабоце;

А. Рухля — намеснік сакратара камітэта камсамола па працоўнаму выхаванню, камандзір зводнага СБА універсітэта;

А. Нікіценка — намеснік сакратара камітэта камсамола па навукова-даследчай рабоце;

М. Прыгодзіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па рабоце з піянерамі і школьнікамі.

**БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА**

А. Абрамовіч, П. Брыгадзін, В. Гарус, П. Гаранін, А. Гаралёва, А. Гулевіч, В. Гуско, А. Клокаў, В. Левашэвіч, І. Міхайлоўская, У. Аджаеў, І. Піроўжнік, М. Прыгодзіч.

**АРГАНІЗАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ**

В. Левашэвіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце, загадчык аддзела.

Л. Ваўчок — загадчык сектара ўліку.

В. Лявоненка — загадчык сектара вучобы камсамольскага актыву, тэхнічны сакратар парткома універсітэта.

Г. Ільяшчук — старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта, кандыдат гістарычных навук, выкладчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.

А. Аладзьін — намеснік старшыні штаба «КП» універсітэта, студэнт IV курса гістфака.

І. Міхайлоўская — загадчык прэс-цэнтра камітэта камсамола, студэнтка II курса факультэта журналістыкі.

Н. Абрамчук — старшыня персанальнай камісіі, аспірант фізфака.

В. Гуско — загадчык сектара інфармацыі і кантролю, студэнтка IV курса механіка-матэматычнага факультэта.

**ІДЭАЛАГІЧНЫ АДДЗЕЛ**

А. Гаралёва — намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце, загадчык аддзела.

У. Карагін — загадчык сектара Ленінскага заліку і грамадска-палітычнай практыкі, супрацоўнік ІПК пры БДУ імя У. І. Леніна.

А. Кавалёва — загадчык сектара ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання, студэнтка IV курса філфака.

А. Гулевіч — намеснік загадчыка сектара ідэйна-маральнага і эстэтычнага выхавання, студэнтка III курса гістфака.

В. Апон — загадчык сектара ваенна-патрыятычнай і спартыўнай работы, студэнт II курса ФПМ.

І. Піроўжнік — загадчык сектара сацыялістычнага спаборніцтва, кандыдат геаграфічных навук, асістэнт кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін.

Т. Румянцава — загадчык лектарскай групы, выкладчык кафедры філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў.

З. Мельнік — старшыня групы «Доўг».

В. Пузікаў — дэкан ФГП, выкладчык кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў.

С. Саетгараеў — загадчык сектара па рабоце ў інтэрнатах, студэнт II курса юрфака.

**АДДЗЕЛ РАБОТЫ ПА МЕСЦУ ЖЫХАРСТВА**

М. Прыгодзіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па рабоце з піянерамі і школьнікамі, загадчык аддзела, выкладчык кафедры беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

І. Лазарэнка — загадчык сектара шэфскай работы, студэнтка IV курса хімфака.

І. Вірынская — загадчык сектара прававога выхавання, студэнтка III курса юрфака.

Н. Емельяновіч — камандзір аператыўнага камсамольскага атрада, студэнт III курса юрфака.

**АДДЗЕЛ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ**

А. Абрамовіч — намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай рабоце, загадчык аддзела, студэнт V курса факультэта радыёфізікі і электронікі.

В. Клюня — загадчык сектара сумеснай работы з кафедрамі грамадскіх навук, выкладчык кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў.

І. Дражына — старшыня савета выдатнікаў, студэнтка IV курса юрыдычнага факультэта.

Т. Гусарэвіч — загадчык сектара новага прыёму, дэкан грамадскіх падрыхтоўчых курсаў, студэнтка III курса гістфака.

М. Дзялендзік — загадчык сектара работы з першакурснікамі, студэнт IV курса факультэта радыёфізікі і электронікі.

У. Капскі — загадчык сектара арганізацыі работы ВВК, студэнт II курса факультэта журналістыкі.

**АДДЗЕЛ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ**

А. Нікіценка — намеснік сакратара камітэта камсамола па навукова-даследчай рабоце, загадчык аддзела, намеснік старшыні савета па НДРС універсітэта.

А. Патрын — старшыня савета маладых вучоных і спецыялістаў універсітэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры паўправаднікоў.

А. Рубанаў — старшыня студэнцкага навуковага савета, студэнт IV курса гістфака.

С. Маргайлік — загадчык студэнцкай сацыялагічнай лабараторыі пры камітэце камсамола універсітэта, студэнтка III курса аддзялення філасофіі.

**АДДЗЕЛ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ І РАБОТЫ З ЗАМЕЖНЫМІ СТУДЭНТАМІ**

А. Клокаў — загадчык аддзела, студэнт V курса фізфака.

Л. Папова — загадчык сектара шэфскай работы з маладзёжнымі саюзамі і зямляцтвамі замежных студэнтаў, супрацоўнік біяфака.

Л. Орсіч — загадчык сектара работы па інтэрвыхаванню на факультэтах, студэнтка IV курса мехмата.

**ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ**

А. Рухля — намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па працоўнаму выхаванню, камандзір зводнага СБА універсітэта, супрацоўнік НДІ ФХП.

В. Атапін — камісар штаба працоўных спраў, студэнт IV курса філфака.

В. Саўчанка — галоўны інжынер штаба працоўных спраў, студэнт IV курса юрфака.

**САКРАТАРЫ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА**

Біяфак — Н. Няхайчык, студэнтка IV курса;

Геафак — Л. Гайдукевіч, студэнт IV курса;

Журфак — В. Дудко, студэнт IV курса;

Гістфак — П. Аксючыц, студэнт IV курса;

Мехмат — А. Казулін, студэнт V курса;

Радыёфізікі і электронікі — О. Чулкоў, студэнт IV курса;

ФПМ — П. Якаўлеў, стажор-выкладчык кафедры МО АСУ;

Фізфак — У. Аджаеў;

Філфак — Ж. Рымкевіч;

Юрфак — А. Войцік, студэнт II курса;

Сакратар камітэта камсамола супрацоўнікаў універсітэта — П. Гаранін;

НДІ ПФП — А. Шыдлоўскі, старшы інжынер.

● НАШЫ ЮБІЛЯРЫ ●

# СЛОВА АБ НАСТАЎНІКУ

1 СНЕЖНЯ 1979 года спаўняецца сорак гадоў вядомаму савецкаму матэматыку акадэміку АН БССР Уладзіміру Пятровічу Платонаву. Нарадзіўся ён у гарадскім пасёлку Стайкі Віцебскай вобласці. У 1956 годзе паступіў у Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна, дзе захапіўся алгебрай. Праз два гады пасля заканчэння універсітэта Уладзімір Пятровіч абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Алгебраічныя лінейныя групы», а ў 1966 годзе — доктарскую на тэму «Тапалагічныя і алгебраічныя лінейныя групы». У 1967 годзе У. П. Платонаў быў выбраны членам-карэспандэнтам АН БССР, а ў 1972 годзе — акадэмікам АН БССР.

У навуковым актыве Уладзіміра Пятровіча—рашэнне шэрагу фундаментальных праблем, якія на працягу многіх гадоў і нават дзесяцігоддзяў заставаліся непрыступнымі, нягледзячы на намаганні буйнейшых матэматыкаў свету.

Выдатныя дасягненні У. П. Платонава ў галіне алгебраічнай геаметрыі і тапалогіі, яго навуковыя даклады на міжнародных матэматычных кангрэсах і іншых прадстаўнічых сімпозіумах узнялі аўтарытэт беларускай матэматыкі ў Савецкім Саюзе і за мяжой. Заслугі У. П. Платонава перад савецкай навукай былі адзначаны высокай узнагародай Радзімы — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

За цыкл работ «Арыфметыка алгебраічных груп і прыведзеная тэорыя» Уладзіміру Пятровічу Платонаву была прысуджана Ленінская прэмія 1978 года. У гэтых работах вырашаны такія фундаментальныя праблемы тэорыі алгебраічных груп і алгебраічнай геаметрыі, як праблема моцнай апраксімацыі, гіпотэза Кнезера-Цітса, праблема Танака-Арціна і многія іншыя.

Першыя крокі, зробленыя пад кіраўніцтвам Уладзіміра Пятровіча, адкрылі перад намі яркі свет матэматычных ідэй і метадаў сучаснай матэматыкі. Нікога не здзіўляла, што ў якасці тэм курсавых і дыпломных работ Уладзімір Пятровіч прапаноўваў нам праблемы, хвалюючыя многіх матэматыкаў свету. На гэтых праблемах вучыў нас думаць і строга выкладваць свае думкі, вучыў правільнаму падыходу да рашэння матэматычных задач і асабістым прыкладам паказваў здзіўляюча прыгожыя рашэнні.

Ужо каля дзесяці гадоў мы працуем з Уладзімірам Пятровічам. І, як і ў студэнцкія гады, адчуваем яго пастаянную ўвагу і падтрымку. Нягледзячы на вялікую занятасць, Уладзімір Пятровіч узначальвае буйнейшы матэматычны цэнтр рэспублікі, вядзе вялікую педагагічную і грамадскую работу.

У дзень саракагоддзя ад імя калектыву кафедры вышэйшай алгебры і ўсяго механіка-матэматычнага факультэта віншуем нашага настаўніка, жадаем яму моцнага здароўя, поспехаў у яго шматграннай дзейнасці і новых вялікіх дасягненняў на нялёгкім шляху матэматычнага пошуку.

**А. БАНДАРЭНКА,**
**дацэнт.**
**А. ШАРАМЕТ,**
**ст. выкладчык.**

# Таленавітыя першакурснікі

Тамара Шлык, адказная за работу з першакурснікамі, задаволена паведамляе:

— Столькі талентаў на першым курсе ў нас ніколі не было! Гэты год кожны другі спявае, танцуе, чытае вершы, малюе.

Напэўна, хімфаку проста пашанцавала? Але справа не толькі ў тым, што прыйшлі вучыцца здольныя камсамольцы. Галоўнае — камітэт камсамола хімфака зацікавіўся сваімі першакурснікамі, пачаў шукаць найбольш таленавітых і прыцягваць да заняткаў у гуртках мастацкай самадзейнасці.

З Колем Кагановічам, Валодзем Громакам і Ленай Гайдучонак я сустрэлася на вечары «Знаёмства першага курса». Гэта было дэбютнае выступленне першакурснікаў ва універсітэце, і таму яны вельмі хваляваліся.

...У зале ціха. Усе слухаюць, як іграе і спявае Коля Кагановіч. Па тварах бачу — падабаецца. Коля спяваў і раней — у школе, для родных, сяброў. Яго песні падымаюць настрой, а ў голасе адчуваецца цеплыня і шчырасць. Гэта заўважылі на хімфаку. Тэатр «Дзень хіміка» з радасцю запрашае Колю прымаць удзел у сваёй рабоце, а таксама і другога першакурсніка — Уладзіміра Громака. Хлопец добра іграе на гітары. спявае. Заўсёды ў яго душы жыла павага да цудоўнага гучання інструмента. Скончыўшы музычную школу па класу баяна, Валодзя самастойна займаецца па класу гітары. Выкананне песень сур'ёзных, якія хвалююць кожную струнку чалавечай душы, — вось яго імкненне. Валодзя і сам піша песні, толькі выносіць іх на суд слухачоў яшчэ не адважваецца.

А вось Лена Гайдучонак вельмі любіць вершы. Яна чытае іх перад слухачамі яшчэ з першага класа. Лену захапляюць вершы М. Алігер, А. Дзяменцева, Р. Раждзественскага. Вялікі сшытак вершаў любімых паэтаў — гэта яе падручнік у жыцці.

Наперадзе яшчэ шмат выступленняў, і самае запаветнае — агляд мастацкай самадзейнасці. І калі раней у аглядзе хімфак займаў не самае лепшае месца, то цяпер вялікая надзея на таленавітых першакурснікаў. Пажадаем ім поспеху!

**І. ЦАЛУЙКА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

РЭЙД

# Пара біць трывогу

ПРАБЛЕМЫ грамадскага харчавання пастаянна знаходзяцца ў цэнтры ўвагі групы народнага кантролю універсітэта. Але, як паказваюць вынікі праверак, некаторыя пытанні пакуль што на месцах вырашаюцца марудна.

...Сталовая № 33 (інтэрнат № 5). Калі наведвальнік упершыню прыходзіць сюды, то ў яго, напэўна, складваецца станоўчая думка аб рабоце гэтага пункта харчавання. Прасторная зала, дзве лініі раздачы, побач буфет, канвеер для прыёму выкарыстанага посуду, шмат пасадачных месц...

Але ўсё гэта толькі на першы погляд.

12 гадзін. Час абеду. Дзверы сталовай (завязаныя ручніком) шырока расчыняюцца. Праходзіць 10—15 хвілін, а чарга ўсё не кранаецца з месца... Яшчэ не прынесены бачкі, не дасмажыліся рыба і катлеты. Вось і стаіць чарга, кідаючы позіркі ў варачны цэх. А каштоўны час ідзе... Гэта — адзін бок справы.

Давайце заглянем за прылавак буфета, лініі раздачы... І вось вынікі. У буфеце было 80 бутэлек піва, тэрмін рэалізацыі якога скончыўся. Выяўлена шмат недабраякасна вымытага посуду. У працэсе рэйду высветлілася, што сталы ў зале мыюцца халоднай вадой, на халадзільніках — шмат пылу. У варачным цэху повары не прытрымліваюцца правілаў асабістай гігіены, працуюць без ручнікоў. Нідзе мы не бачылі мыльніц ці прыстасаванняў для захоўвання мыла. Парушаюцца таксама правілы захоўвання харчовых прадуктаў. У адной камеры знаходзяцца і свежамарожаная рыба, і яблыкі, і языкі, і многае іншае.

Не клапоціцца адміністрацыя сталовай і пра аблягчэнне працы для сваіх работнікаў. У кандытарскім цэху не працуе выцяжная вентыляцыя. Да гэтага часу ў сталовай няма хлебарэзкі, таму больш як 200 буханак хлеба ў дзень прыходзіцца рэзаць уручную.

А можа адміністрацыя не ведае, як павінен выглядаць той ці іншы бок справы? На гэта пытанне загадчыца вытворчасці Наталля Мікалаеўна Папковіч вельмі жвава адказала:

— Мы атрымліваем новыя правілы і самі ўмеем іх чытаць. А што датычыцца посуду, то ў гэтым вінавата мыечная машына. Пыл, дык гэта...

Сталовая НДІ ПФП, што ў Шчомысліцах. Вынікі праверкі таксама не радуюць.

— Кожны дзень адно і тое ж меню, на сталах ніколі не бывае сурвэтак, абслугоўванне праходзіць вельмі марудна, сталовая адкрываецца, а абслугоўваць пачынаюць праз 15—20 хвілін. Чыстыя і выкарыстаныя разносы захоўваюцца на акне, — гавораць пастаянныя наведвальнікі, студэнты 4-га курса Ф. Кухарчук, М. Рысейчык, В. Бусько.

Паслухаем, што скажа на гэта загадчыца вытворчасці Г. Я.Міснік:

— У нас парушаецца тэхналогія мыцця посуду. А куды ж дзенешся, калі мыечную машыну нам мяняюць з 1975 года. Касавая машына таксама патрабуе неадкладнай замены, таму што яна не адпавядае патрабаванням часу. Грошы касіру прыходзіцца захоўваць у кішэнях...

Яшчэ горшае становішча спраў мы назіралі ў сталовай галоўнага корпуса універсітэта.

Уявіце сабе наступны малюнак. У кожную шклянку не даліваецца па 11 грамаў кавы і 20 грамаў кампоту. Калі ўлічыць, што сталовая за дзень абслугоўвае каля 600 наведвальнікаў, то атрымліваецца значная лічба. А дзе гарантыя таго, што наведвальнік атрымлівае сваю норму ў іншых стравах?

Вось такое ўражанне пакінулі ў рэйдавай брыгады пункты грамадскага харчавання нашага універсітэта. Уражанне, мякка кажучы, не з лепшых.

**М. КАВАЛЁЎ,**
**член групы народнага кантролю універсітэта,**
**В. ШАЎЧУК,**
**наш кар.**



# Тэхніка, фантазія і студэнты

ФОТАРЭПАРТАЖ

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1—2-й стар.).**

Калі рашэнне правільнае, на пульце загараецца адказ, маўляў, задача рошана ўмела, адзнака — выдатна. А яшчэ ёсць такі нечаканы подпіс: «Запішыце заданне на дом. Да пабачэння».

Аказваецца і машына мае свае эмоцыі. І ўсё ж бясстрасна ЭВНС рэагуе на няправільнае рашэнне: «Ваш адказ недакладны...» І рабі што хочаш. Увогуле, што рабіць, — вядома. Трэба зноў і зноў уважліва праверыць увесь ход рашэння. І калі памылка будзе выпраўлена, машына зноў засвеціцца прыемным зялёным агеньчыкам з выдатнай адзнакай.

**М. ДУБОВІК.**
Фота аўтара.





# ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

**25 кастрычніка гэтага года ў нашай газеце быў змешчаны артыкул «Галоўны крытэрый поспеху», у якім зроблены шэраг крытычных заўваг у адрас прафсаюзнага бюро геаграфічнага факультэта. Сёння мы змяшчаем рэагаванне, якое даслаў у рэдакцыю сакратар партыйнага бюро факультэта М. К. Чартко:**

«Камітэт камсамола, прафбюро на сумесным пасяджэнні з удзелам сакратара партбюро Н. К. Чартко абмеркавалі 21 лістапада 1979 года змест матэрыялу «Галоўны крытэрый поспеху», які быў надрукаваны ў вашай газеце 25 кастрычніка.

Выступіўшыя адзначылі, што на геаграфічным факультэце маюць месца недахопы ў рабоце прафбюро. Недастаткова прад'яўляецца патрабаванняў з боку прафбюро да асобных студэнтаў, мала праводзіцца мерапрыемстваў у інтэрнаце. Вырашана значна палепшыць прафілактычную і выхаваўчую работу сярод студэнтаў у пытаннях вучобы, быту, працы і выкананні грамадскіх даручэнняў. Новаму саставу прафбюро і камітэту камсамола рэкамендавана звярнуць увагу на выхаванне у студэнтаў пачуцця адказнасці за даручаную справу, арганізаванасці і дысцыпліны».

Добры дзень, сябры! З нецярплівасцю чакаў з вамі сустрэчы. Хачу падзяліцца сваёй навіной і заадно параіцца. Вы, напэўна, памятаеце, што мы не даехалі да Мінска і без грошай засталіся на адным з вакзалаў. Памятаеце? Дык вось тады і падышоў да мяне Вадаліваў са сваёй «рацухай». Хоць я і скептычна аднёсся да яе, але на гэты раз яна была неблагая. Дзве ночы запар адгружалі мы вугаль на таварнай станцыі. І толькі на трэцюю купілі білеты на Мінск. Ну, а потым што? Потым усё было вельмі проста. Я, Падказкін, Пісулькін, Шура Шпора паехалі на бульбу. Нас не вызвалілі ад сельгасработ, таму што атрад быў неафіцыйны. І праз два дні пасля прыезду мы трасліся ў аўтобусе ў калгас, дзе працавалі аднакурснікі. Незалікіна і Вадалівава сустрэў пасля бульбы, калі было першае пасяджэнне нашай кафедры. Загадчык кафедры Незалікін, як ні ў чым не бывала, пачаў пасяджэнне, аб'явіў пытанні. Калі пачалі выступаць, успомнілі пра сакратара, якога забыліся выбраць. Тут Вадаліваў прапанаваў маю кандыдатуру:

— Хай пісака сядзе. У яго рука ўжо набітая. Вунь як размаляваў, — ён дастаў з папкі газету і трасянуў над галавой. — Мне ад яго пісаніна і зараз ікаецца.— Вадаліваў амаль не кінуў у твар мне газету.

Што тут пачалося, нават нельга перадаць. Быццам гэтага і чакалі. Незалікін таксама глянуў на мяне так, што ледзь не спапяліў позіркам.

— Хто дазваляў, — крычаў ён, — выносіць смецце з нашай хаты!

— І правільна зрабіў, — уступіліся Шура і Падказкін. — Даўно ўжо патрэбна было вынесці. Няхай пабачаць усе, як ідуць вашы справы. Тым больш, у апошні час кафедра зусім страціла сувязь з газетай, з масамі. А то вунь Гошу да гэтага часу клічуць ліфцёрам. Астатнія папрыязджалі з будатрадаў — ганар. А мы? Гэта для прыкладу. Хто вінаваты? Загадчык кафедры.

— Пачакайце, — Незалікін падняў руку,—у нас, здаецца, пасяджэнне кафедры, а не кірмаш. Садзіся, таварыш Паінькін,—звярнуўся ён да мяне афіцыйна, — і пішы пратакол нашага пасяджэння.

Я ўзяў ручку і запісаў:

**Пратакол № 1**

пасяджэння кафедры агульнага смехаробства ад 28 лістапада 1979 года.

Парадак дня: 1. Вынікі работы кафедры за прайшоўшы час.

2. Перспектывы кафедры на будучае.

З уступным словам выступіў загадчык кафедры тав. Незалікін. Ён расказаў аб рабоце кафедры, звярнуў увагу на дысцыпліну, якая ў апошні час пачала рэзка падаць. Прывёў, як прыклад, нядаўняе выступленне ў газеце тав. Паінькіна (г. зн. мяне). Намаляваў прысутным план развіцця кафедры, у якім прапанаваў расшырыць яе яшчэ на некалькі чалавек. Пасля гэтага прыступілі да абмеркавання. Першым слова ўзяў **Вадаліваў:**




— Я падтрымліваю тав. Незалікіна. У сваім выступленні ён адзначыў найбольш слабыя бакі работы нашай кафедры. Я прапаную абмеркаваць паводзіны тав. Паінькіна.

**Шура:**

— У сваім выступленні загадчык вельмі падружовіў усю нашу работу, узровень якой ў апошні час вельмі панізіўся. Няма сувязі кафедры з факультэтамі. Вынікі працоўнага семестра зусім упушчаны. Наконт Паінькіна я не згодзен. Ён паступіў вельмі правільна. Няхай усе чытачы дапамогуць нам у выпраўленні становішча на кафедры.

**Падказкін:**

— Прапаную сур'ёзна абмеркаваць і прааналізаваць дзейнасць тав. Незалікіна як загадчыка кафедры. Уласна ад загадчыка і залежыць поспех усёй нашай працы. Нарэшце, ён не вельмі зарэкамендаваў сябе як камандзір нашага атрада. Гэта гаворыць аб яго недальнабачнасці. Аналізуючы работу нашай кафедры агульнага смехаробства, ад якой хочацца не смяяцца, а плакаць, прапаную перайменаваць яе ў кафедру смехаробства і сатырычнага аналізу. Паглядзіце навокал, сябры!

**Пісулькін:**

— Падтрымліваю тав. Падказкіна. Ён мае рацыю. У нас ёсць усе магчымасці, патрэбен добры кіраўнік.

**Вадаліваў:**

— І добрасумленныя супрацоўнікі. Чаму маўчыць тав. Шпора аб сваёй вучэбнай дысцыпліне, паспяховасці? Прапаную вынесці на суд чытачоў яго паводзіны як гультая. Паглядзіце на ведамасць, яго заліковую кніжку. Ён жа зусім закінуў заняткі.

**Шпора:**

— З заўвагамі дацэнта Вадалівава згодзен. Пастараюся выправіцца. У нашых выступленнях праходзіць пытанне аб сувязі кафедры з іншымі факультэтамі і з газетай. Таму прапаную назначыць тав. Паінькіна нашым карэспандэнтам у газеце «Беларускі універсітэт». Дарэчы, сёння да нас прыйшло пісьмо з аднаго факультэта, дзе паведамляецца аб жыцці студэнтаў і выкладчыкаў. Мы павінны абмеркаваць яго. Няхай Паінькін аднясе яго ў газету. Наконт загадчыка кафедры. Прапаную часова назначыць лабаранта Пісулькіна.

У сваіх далейшых спрэчках супрацоўнікі кафедры прыйшлі да агульнага рашэння:

1. З мэтай паляпшэння работы кафедры вызваліць ад пасады загадчыка кафедры тав. Незалікіна і назначыць яго на пасаду лабаранта. Часова выконваць абавязкі загадчыка кафедры назначыць тав. Пісулькіна.

2. Арганізаваць пры кафедры прэс-цэнтр і назначыць кіраўніком яго тав. Паінькіна.

3. Аб'явіць конкурс на вакантную пасаду загадчыка кафедры.

**4. Разгледзець пытанне аб перайменаванні кафедры агульнага смехаробства ў кафедру гумарыстычнага і сатырычнага аналізу.**

5. Абмеркаваць на старонках газеты паводзіны тав. Шпоры, характарыстыкі з факультэтаў і малюнкі з натуры.

Прыстутнічалі: пяць членаў кафедры.
Галасавалі: «за» — усе.
Сакратар: **Гоша ПАІНЬКІН.**

---

У ноч перад апошнім экзаменам Шуру прысніўся незвычайны сон. Ён сядзеў за сталом і стомлена глядзеў на велізарны стос падручнікаў. У галаве было пуста, і яна гудзела, як тэлеграфныя правады. Перад вачамі мільгалі рознакаляровыя зорачкі. Было тры гадзіны ночы.

● ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК

# ЦУД

«Усё. Трэба канчаць»,— падумаў Шура і хацеў ужо ісці спаць, як стос раптам зварухнуўся з месца, і падручнікі, нібы птушкі, размахваючы ў паветры сваімі шэрымі вокладкамі, пачалі лётаць па пакоі. У Шуры ад нечаканасці ўзняліся валасы.

— Куды вы? — пасля імгнення нерашучасці паспеў запытаць ён.

— Ад цябе далей, гультай,— гучна адказаў самы тоўсты з падручнікаў і абурана прашалясцеў старонкамі.

— Я не гультай, — пакрыўджана сказаў Шура і пачырванеў, нібы памідор.

— Гультай, гультай,— хорам пацвердзілі падручнікі і папалі наперабой:

— Не хадзіў на заняткі...
— Не пісаў канспектаў...
— Ніколі не адкрываў нас...

Шура адчуў сябе злачынцам. І калі адзін з падручнікаў прапанаваў пазбавіць яго звання студэнта, Шура зразумеў, што надышоў час расплаты.

— Пашкадуйце,— ледзь чутна прамямліў ён,— усё было, усё. Я вінаваты. Я больш не буду. Злітуйцеся. Дапамажыце мне. Заўтра апошні экзамен. А я нічога не ведаю. Гарыць мая стыпендыя,— голас Шуры дрыжаў, як полымя васкавой свечкі. Падручнікі на момант прыціхлі. Па шчаках Шуры няспынным ручайком беглі слёзы.

— Добра,— адказаў самы тоўсты з падручнікаў і нячутна апусціўся на стол,— толькі памятай — у апошні раз. Адкрывай маю трынаццатую старонку і чытай.

Шура не паверыў сваім вушам. Як у ліхарадцы, ён пачаў перагортваць старонкі. Літары і лічбы зліліся ў адзіную чорную пляму і... Шура прачнуўся.

Было адзінаццаць гадзін раніцы.

«Усё, канчаецца экзамен, а я нічога не ведаю»,— падумаў Шура і раптам успомніў пра сон. Ён хутка кінуўся да стала, захапіў самы тоўсты падручнік і выбег на вуліцу...

У аўдыторыю, дзе ўжо сядзелі апошнія студэнты, Шура ўвайшоў цвёрда.

— Што будзе, тое і будзе, — супакоіў ён сам сябе і ўзяў білет. На яго бліскучай, белай паверхні былі надрукаваны пытанні, адказы на якія Шура і паспеў прачытаць на 13-й старонцы, калі ехаў у аўтобусе.

«Цуд», — усхвалявана падумаў ён і пераможна зірнуў на выкладчыка, які ўважліва праглядаў яго заліковую кніжку.

# НЕДАРЭЧНАСЦІ АЛОЎКА



Без слоў.

Ніхто не стане спрачацца з тым, што «плаваць» на падручніках намнога зручней, чым на экзаменах.



Вельмі часта можна бачыць аб'явы такога характару: «Запрашаюцца паступаць у ВНУ футбалісты, лёгкаатлеты, хакеісты...».

І вось што з гэтага атрымліваецца.



МАЛЮЕ ШУРА ШПОРА

● ЦЯП-ЛЯП

## З ХАРАКТАРЫСТЫК

«За время работы зарекомендовала себя как инициативный, думающий сотрудник...»

(Біялагічны факультэт).

Відаць, на факультэце ёсць супрацоўнікі, якія не думаюць? Патрэбна неадкладна высветліць іх прозвішчы і напісаць адпаведныя характарыстыкі.

«...поддерживает спортивную честь факультета».

(Біялагічны факультэт).

Цікава, пры дапамозе чаго? Калі выкарыстоўваюцца дапаможныя матэрыялы (накшталт вяроўкі, ланцуга, абцугоў), то яны наўрад ці абароняць спартыўны гонар факультэта.

«Результаты исследований опубликованы в 14 работах в соавторстве и лично представлена к защите кандидатская диссертация».

(Фізічны факультэт).

Факт заслугоўвае ўвагі...


Беларускі універсітэт

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ

29 лістапада 1979 г.
Заказ № 1911. АТ 10941

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19

В. а. рэдактара
В. П. ВАРАБ'ЁЎ